жр 3218
Бібліятэка АН БССР

Смерць нямецкім акупантам!

ПРАЧЫТАЎ—ПЕРАДАЙ ДРУГОМУ

# НАРОДНЫ МСЦІЦЕЛЬ

ОРГАН ІВЕНЕЦКАГА РАЙКОМА КП(б) БЕЛАРУСІ

№ 7. Серада, 16 чэрвеня 1943 г.

ПАГРОЗАМІ І ПРЫМУСАМ ГІТЛЕРАЎСКІЯ БАНДЫТЫ ГОНЯЦЬ БЕЛАРУСАЎ У ГЕРМАНІЮ НА КАТАРЖНУЮ ПРАЦУ, НА ГОЛАД І СМЕРЦЬ.

БРАТЫ І СЁСТРЫ! ІРВІЦЕ ЛАНЦУГІ ФАШЫСЦКАГА РАБСТВА, ЗРЫВАЙЦЕ ЗЛАДЗЕЙСКІЯ НАМЕРЫ ГІТЛЕРАЎСКІХ ЗАБОЙЦАЎ!

## СМЕРЦЬ НЯМЕЦКІМ РАБАЎЛАСНІКАМ!

Мямінучую сваю гібель нямецкія захопнікі спрабуюць адцягнуць за лік нашага народа, уганяючы яго на катаргу ў Германію, на голад, здзекі і смерць. Азвярэлыя бандыты не гнушаюцца ніякімі метадамі ашуканства, каб заманіць народ у свае звярыныя сеці. Яны выклікаюць насельніцтва ў раён для праходжання так званай „рэгістрацыі", каб акружыць, загнаць, як скаціну, у вагоны і ўвесці ў свае логава. Яны урываюцца, як бандыты, у вёску і пад кулямётамі „вярбуюць" так званых „дабраахвотнікаў." Такую гнусную, цынічную вярбоўку правялі гэтымі днямі фашысцкія людаеды ў мястэчку Ракаў і ў прылягаючых вёсках і ў многіх вёсках Стаўбцоўскага, Мірскога, Івенецкага і другіх раёнаў вобласці. 18-га чэрвеня, па загаду баранавіцкага людаеда Зернера, усё насельніцтва ад 16 да 45 гадоў Мірскога і Стаўбцоўскага раёнаў павінна зьявіцца для адпраўкі на катаргу ў Германію. Нямецкім разбойнікам патрэбна рабочая сіла, каб каваць зброю, каб заліваць патокамі крыві нявінных дзяцей, старыкоў і матак нашу родную зямлю.

Браты і сёстры! Ірвіце ланцугі фашысцкага рабства! Зрывайце зладзейскія намеры гітлераўскіх забойцаў! Не верце ніводнаму слову і абяцанню фашысцкіх вярбоўшчыкаў. Не зяўляйцеся на вярбовачныя пункты. Скрывайцеся ў лясы ад прымусовага ўгону ў нямецкае рабства. Бярэце зброю, забівайце лютага звера-немца. Арганізоўвайце самаабарону сваіх вёсак ад нямецкіх банд. Чырвоная Армія ідзе. Яна прыйдзе к нам на дапамогу.

Партызаны і партызанкі! Уцягвайце шырокія слаі савецкага насельніцтва ў актыўную вызваленчую барацьбу, ратуючы тым самым савецкіх грамадзян ад угона ў нямецкае рабства і знішчэння гітлераўскімі звярамі.

За гора народнае, за мукі нашых людзей—адпомсцім фашысцкім гадам. Забіваць немца—для савецкага грамадзяніна закон, сэнс нашага жыцця. Няхай ненавісць наша вядзе нас ў бой з заклятым ворагам да поўнай перамогі, да таго шчаслівага дня, калі яркае сонца ўзыйдзе над нашай роднай зямлёй, ачышчанай ад немца!

## НА ФРАНТАХ АЙЧЫННАЙ ВАЙНЫ

(З паведамленняў Совінформбюро)

На працягу з 7 па 14 чэрвеня на франтах істотных змен не адбылося.

За прайшоўшы тыдзень адзначалася ўзмоцненая дзейнасць нашай авіяцыі. У паветраных баях за гэты час знішчана 498 ворожых самалётаў, нашы страты 153 самалёты.

У ноч на 8, 9, 10, 11, і 12 чэрвеня злучэнні нашай авіяцыі бамбілі варожыя аэрадромы. Знішчана вялікая колькасць варожых самалётаў і выклікана многа пажараў.

У ноч на 13 чэрвеня наша авіяцыя бамбіла чыгуначныя вузлы Бранск, Гомель і чыгуначную станцыю Карачаў. Разбураны склады і разбіты воінскія эшалоны.

У ноч на 14 чэрвеня вялікія злучэнні нашай авіяцыі зрабілі налёт на чыгуначны вузел Арол. Бамбардыроўкай знішчана многа варожых эшалонаў.

## Сума падпіскі на пазыку перавыканана

5—га чэрвеня Савецкім Урадам была выпушчана „Другая Дзяржаўная Ваенная Пазыка 1943 года" на суму 12 мільярдаў рублёў. За 7 дзён, з 5-га па 12-га чэрвеня, сума падпіскі дасягнула больш 23 мільярдаў рублёў. З 13—га чэрвеня падпіска спынена.

## АДЗІНАЦЦАТЫ ЭШАЛОН

З кожным днём расце баявая актыўнасць атрада імені Будзённага, якім камандуе Г. Атрад узяў пад свой кантроль участак Н—скай шасейнай дарогі.—Варожыя машыны не будуць безнаказана хадзіць па нашых дарогах—заявілі падрыўнікі атрада. Гэтага яны ўпорна і настойліва дабіваюцца. Дзесяткі гітлераўцаў разам з машынамі ўзляцелі ў паветра на ўмела замаскіраваных падрыўнікамі мінах. Толькі за апошні час на гэтым участку дарогі партызаны падарвалі 16 варожых аўтамашын. Пры ўзрывах забіта 68 і ранена 20 гітлераўцаў.

Усё больш узмацняе ўдары атрад і па чыгуначных камунікацыях ворага. Не так даўно група партызан пад камандаваннем А. узарвала варожы эшалон, які ішоў на фронт. У рэзультаце ўзрыва знішчан паравоз і 5 вагонаў з жывой сілай. 4 вагоны моцна пашкоджаны. Пры крушэнні забіта 37 і ранена 75 гітлераўцаў. Гэта на шчоту атрада падарваны адзінаццаты варожы эшалон.

Камісар атрада Б.

## 18 тыс. палонных

Як паведамляюць з Англіі, на занятых англа-амерыканскімі войскамі астравах Пантэлерыя, Лампедуза і Ліноса ўзята ў палон 18 тыс. італьянцаў.

## НЕ ПРАЙШЛІ

Разведка партызанскага атрада далажыла камандаванню, што група немцаў і паліцейскіх, колькасцю да 100 чалавек, якая знаходзіцца ў вёсцы К. мае намер перапраўіцца на левы бераг ракі і пранікнуць у вёску З.

Атрад паставіў сабе задачай: не даць ворагу перабрацца цераз раку. Высунуўшыся наперад, партызаны занялі абарону. Нягледзячы на моцны мінамётна-кулямётны агонь ворага, партызаны не аставілі свае агнявыя пазіцыі. Арганізаваным агнём, смеласцю і адвагай яны вымусілі фашыстаў пакінуць вёску К.

...У ходзе боя фашысты засеклі агнявыя точкі правага фланга абароны партызан. Для таго, каб аблягчыць становішча правага фланга, партызану Івану К. было прыказана прабрацца на левы фланг, адкрыць інтэнсіўны агонь і адцягнуць увагу ворага на сябе. Пад градам куль, рыскуючы жыццём, партызан К. выканаў пастаўленую перад ім задачу і гэтым самым аблегчыў становішча правага фланга... Выдатна дзейнічалі ў баю кулямётчыкі М., Т., Р., Н. Сваім агнём яны забілі і паранілі 9 гітлераўцаў.

Намер фашыстаў прабрацца ў вёску З. і аграбіць мірных жыхароў сарвалі партызаны.

Камандзір атрада
ім. Жукава К.

## З'ЕЗД ПОЛЬСКІХ ПАТРЫЁТАЎ

8-га чэрвеня ў Маскве адкрыўся з'езд польскіх патрыётаў. На з'езд сабраліся прадстаўнікі польскага народа, пражываючыя ў СССР, а таксама ў Польшчы. Сярод іх польскія рабочыя, інтэлігенцыя, прадстаўнікі польскай арміі. На з'езд прыбыў праз лінію фронта ксёндз Кукш, які змагаецца ў радах польскага партызанскага атрада з нямецкімі захопнікамі. На з'ездзе прысутнічае камандзір польскай дывізіі імені Тадэуша Касцюшкі палкоўнік Зігмунд Бэрлінг, начальнік штаба гэтай дывізіі Вітус, вядомы варшаўскі публіцыст Стэфан Індрыкоўскі і др.

Выступіўшыя дэлегаты расказалі з'езду аб барацьбе польскага народа з нямецкімі акупантамі, аб дапамозе Савецкага Урада польскім грамадзянам, пражываючым у СССР. Партызан ксёндз Кукш расказаў як змагаюцца польскія патрыёты з лютым ворагам польскага народа—нямецкімі захопнікамі, якія імкнуцца знішчыць польскі народ, яго культуру, мову і рэлігію. Палкоўнік Берлінг аддаў з'езду рапарт аб гатоўнасці дывізіі імені Тадэуша Касцюшка змагацца да апошняй каплі крыві з нямецкімі бандытамі разам з гераічнай Чырвонай Арміяй.—Шлях на радзіму ляжыць праз поле змагання адсюль з Савецкага Саюза—заявіў палкоўнік Бэрлінг. Дэлегаты ў сваіх выступленнях выразілі гатоўнасць польскага народа разам з Савецкім народам змагацца з заклятым ворагам усяго чалавецтва—фашызмам. З'езд прайшоў пад лозунгам: ,,Няхай жыве свабодная Польшча''.

## ГАРНІЗОН ВОСТРАВА ПАНТЭЛЕРЫЯ КАПІТУЛІРАВАЎ

11-га чэрвеня англа-амерыканскія войскі занялі італьянскі востраў Пантэлерыя. Пачынаючы з 19-га мая авіяцыя саюзнікаў штодзённа падвяргала інтэнсіўнай бомбардыроўцы гарнізон вострава. Пасьля паўторнага ўльтыматума гарнізон вострава капітуліраваў.

Узята ў палон 10 т. італьянцаў.

Востраў Пантэлерыя мае вялікае стратэгічнае значэнне як авія-база Італіі ў Міжземным моры. Востраў Пантэлерыя знаходзіцца паміж востравам Сіцылія і Афрыкай.

13-га чэрвеня капітуліравалі гарнізоны італьянскіх астравоў ў Міжземным моры Лампедуза і Ліноса. На в. Лампедуза ўзята ў палон 3 тыс. італьянцаў.

## ЗАСАДА

...На ўскраі лесу прытаілася ў засадзе група партызан пад камандаваннем С. Яна атрымала заданне знішчыць варожую аўта-калону, якая павінна рухацца па шасэ. Доўга чакаць на гэты раз не прыйшлося... Калі пярэднія машыны зраўняліся з левым краем засады, партызаны адкрылі агонь. Першыя дзве машыны назаўсёды спыніліся. На астатніх машынах фрыцы пусціліся ўцякаць, але былі насцігнуты меткім агнём кулямётчыкаў, мінамётчыка Б. і вінтовачным агнём групы. Усе машыны былі знішчаны.

Уцалеўшыя гітлераўцы рашылі знішчыць засаду лабавым ударам. Але, напароўшыся на арганізаваны агонь партызан, былі вымушаны адкаціцца, пакінуўшы забітых і раненых. Тады фашысты рашылі абыйсці засаду з правага фланга. Але, тут іх ужо даўно чакала, заняўшы зараней выгадныя пазіцыі, група партызан пад камандаваннем Д. Атрымаўшы і тут як след ад партызан, застаўшыяся ў жывых гітлераўцы ў беспарадку ўцяклі, пакінуўшы 5 аўта-машын і 16 забітых і параненых...

...Група партызан атрымала заданне выбіць засеўшага ворага з мельніцы. Першым к варожаму пункту прыблізіўся партызан Карла С. Расстрэльваючы ў упор гітлераўцаў, ён смела і адважна павёў за сабой партызан на штурм варожага гнязда. Праз некалькі мінут яно было палаўлена.

Метка вёў агонь па ворагу ў гэтым баі кулямётчык З. Не першы раз удзельнічаў ён са сваім кулямётам у засадзе. На сваім рахунку помсты кулямётчык З. мае 3 знішчаных машыны і 30 гітлераўцаў.

Баявое заданне група выканала з чэсцю. Ф. С.

Рэдкалегія.